тыдні...

Дню беларускай навукі. Удзел бралі прыкладна 250 прадстаўнікоў акадэмічнай, універсітэцкай і галіновай навукі, маладыя вучоныя, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, вышэйшых навучальных устаноў краіны, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса. Найлепшым вучоным і даследчыкам былі ўручаныя ўзнагароды. Пад час сходу была арганізаваная выстава дасягненняў і найбольш значных вынікаў навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці Беларусі.

✓ **4 лютага** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася **прэзентацыя Дзяржаўнага рэестра кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь.**

Беларусы валодаюць надзвычай багатай і непаўторнай кніжнай спадчынай, якая з'яўляецца вялікім скарбам нашага народа. Вялікія кнігазборы маюць як дзяржаўныя захавальнікі (бібліятэкі, музеі, архівы, універсітэты і інш.), так і прыватныя ўладальнікі. Пры гэтым кніжная спадчына да нядаўняга часу была недастаткова вядомай і слаба ўлічанай, што вельмі ўскладняла яе папулярызацыю і вывучэнне. Дзеля аб'яднання намаганняў грамадства для правядзення ўліку, апісання і папулярызацыі кніжных помнікаў Беларусі быў створаны Дзяржаўны рэестр кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь. Яго стварэнне рэгламентуецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, ён стане найважнейшай падзеяй у працы са старажытнымі і каштоўнымі кнігамі, што зберагаюцца ў нашай краіне.

Цягам апошніх трох гадоў вялася праца па стварэнні канцэпцыі Рэестра, распрацоўцы праграмнага забеспячэння, метадычнай і тэхналагічнай дакументацыі, а таксама тэставанні створанага Рэестра. У рэжыме тэставання і вопытнай эксплуатацыі больш за 1 тыс. кніжных помнікаў ужо ўключана ў Рэестр. Сёння можна ўпэўнена сказаць, што створаны Рэестр уяўляе сабою магутную інфармацыйную сістэму, якую можна шырока абнародаваць і прыступіць да працы з Рэестрам на агульнанацыянальным узроўні.

✓ **5 лютага** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь пачала працу выстава **«Моўны код»**, прымеркаваная да Міжнароднага дня роднай мовы. (International Mother Language Day адзначаецца штогод 21 лютага ў адпаведнасці з рашэннем ЮНЕСКА 1999 г. і накіраваны на заахвочванне моўнай разнастайнасці, папулярызацыю і захаванне моўных і культурных традыцыяў.)

Мы ўспрымаем мову як дадзенасць, а між іншым гісторыя беларускай мовы нагадвае дэтэктыў з закручаным сюжэтам і яскравымі адметнасцямі. Ці ведаеце вы, што ў XVI ст. старабеларуская мова была афіцыйнай у Вялікім Княстве Літоўскім; калі нарадзілася літара Ў; што беларуская мова мае тры алфавіты – кірылічны, лацінскі і арабскі?

На выставе прадстаўленыя творы Уладзіміра Басалыгі з серыі «Мова наша родная» (1980 – 1990-х гг.), Томы Пракоф'евай «Беларускі алфавіт», артэфакты са збору гістарычнага музея. Выстава дапамагае ўзнавіць пэўныя веды пра беларускую мову, узгадаць любімыя словы, пацешыць наведнікаў інтэрактыўнымі элементамі.

Акрамя выставы, музей з нагоды Міжнароднага дня роднай мовы пра-